ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1979 г.

№ 28 (1254)

11 кастрычніка

ЧАЦВЕР

Цана 2 кап.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

## Сумеснымі намаганнямі

Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» яшчэ раз паказала пастаянны клопат партыі і ўрада аб удасканаленні дзейнасці ВНУ. Іменна ад якасці і эфектыўнасці пяці год вучобы залежыць, з якім багажом ведаў прыйдзе ў заўтрашні дзень сённяшні студэнт.

Як палепшыць працэс падрыхтоўкі будучых спецыялістаў і арганізацыю вытворчай практыкі студэнтаў, як развіваць у студэнтаў самастойнасць працы — такія задачы стаяць перад партыйным бюро гістарычнага факультэта ў новым навучальным годзе.

Дабівацца, каб кожны выкладчык штодзённа расшыраў свой палітычны і культурны кругагляд, быў прыкладам высокай камуністычнай ідэйнасці, партыйнасці, творчых адносін да працы, маральнай чысціні — вось галоўныя патрабаванні да сённяшняга інтэлігента. Партыйная арганізацыя гістарычнага факультэта многае робіць для таго, каб малады спецыяліст адпавядаў патрабаванням часу. Для студэнтаў-першакурснікаў чытаюцца спецыяльныя лекцыі, як працаваць над матэрыяламі класікаў марксізму-ленінізму, дакументамі партыі і ўрада. Тэмы большай колькасці курсавых і дыпломных работ не распрацаваны ў сучаснай навуковай літаратуры. Гэта дае магчымасць студэнтам самастойна, з творчым падыходам, пад кантролем навуковых кіраўнікоў, вырашаць навуковыя праблемы. Гурткі, распрацоўка навуковых даследаванняў, манаграфій, артыкулы — усё гэта дае магчымасць для развіцця самастойнай творчасці студэнтаў.

Мяркуецца, што на факультэце будуць створаны аддзелы па навуковай працы. Гэта значыць, навуковыя аддзелы будуць набліжацца да факультэтаў.

Для падрыхтоўкі больш высокакваліфікаваных спецыялістаў на факультэт запрашаюцца чытаць лекцыі выкладчыкі з другіх ВНУ краіны, а таксама з-за мяжы (ГДР, Балгарыі, Польшчы). Вось і ў гэтым навучальным годзе запрошаны чытаць лекцыі на факультэце 9 выкладчыкаў (4 дактары і 5 кандыдатаў гістарычных навук).

Асабліва хочацца адзначыць выкладчыкаў кафедры новай і навейшай гісторыі. На кафедры праводзяцца сумесныя пасяджэнні з акадэмічнымі групамі, якія прысвячаюцца абмеркаванню бягучай паспяховасці, падрыхтоўкі да сесій і іх вынікам. Значнае месца ў рабоце кафедры займае вывучэнне і распаўсюджанне вопыту прымянення тэхнічных сродкаў навучання ў выкладанні асобных дысцыплін, наведванне і аналіз адкрытых лекцый, узаеманаведванне лекцый з мэтай абмену вопытам.

Разам з тым патрэбна адзначыць, што ў рабоце факультэта маюць месца і недахопы. Недастаткова ўвагі на кафедрах і факультэце аддаецца вучэбна-метадычнай і навукова-метадычнай рабоце.

У навуковым працэсе не заўсёды знаходзяць адлюстраванне навейшыя дасягненні навукі, тэхнікі, культуры. Недастаткова аператыўна вывучаюцца і ўкараняюцца вопыт і рэкамендацыі педагогікі і методыкі вышэйшай школы, якія ёсць у ВНУ краіны. Ёсць праблемы і з падшэфнымі раёнамі.

Вось ужо на працягу некалькіх год мы з'яўляемся шэфамі Стаўбцоўскага раёна. Выкладчыкі факультэта праводзілі семінары, прысвечаныя праблемам выкладання гісторыі культуры ў сярэдніх школах, студэнты выступалі з лекцыямі, канцэртамі, і, карацей кажучы, нашы сувязі мацаваліся. Пасля гэтага, рашэннем Мінскага абкома партыі, арыентацыя была зменена на Уздзенскі раён. Зараз мы пішам гісторыю Уздзенскага раёна і горада, ствараем краязнаўчы музей і г. д. Але вось гэтыя змены падшэфных раёнаў ствараюць не зусім прыемныя ўмовы, бо прыходзіцца пачынаць сваю працу кожны раз спачатку.

У пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб вышэйшай школе асаблівая ўвага звяртаецца на сувязь навукі з вытворчасцю. Гэта значыць, што філасофскія кафедры павінны наблізіць тэматыку курсавых і дыпломных работ непасрэдна да праблем вытворчасці. У сувязі з гэтым узнікла неабходнасць стварыць на факультэце свае кафедры філасофіі і палітэканоміі.

Кожны год штаб працоўных спраў дае факультэту завышаны план на фарміраванне СБА студэнтамі. Гэта патрабуе ад нас пераносу студэнтам вытворчай практыкі і стажыровакі, што, безумоўна, перашкаджае вучэбнаму працэсу.

Не хапае ў нас таксама дастатковай колькасці падручнікаў, асабліва па старажытнай гісторыі. Усяго па 2—3 падручнікі прыходзіцца на адну акадэмічную групу. Гэтае пытанне таксама патрабуе неадкладнага вырашэння. Неабходна павысіць інфармаванасць выкладчыкаў. Для гэтага патрэбна запрашаць для чытання лекцый кваліфікаваных лектараў райкомаў, гаркомаў і іншых адказных асоб, якія б знаёмілі выкладчыкаў са становішчам у краіне і за мяжой.

Маюцца недахопы ў рабоце з маладымі выкладчыкамі па павышэнню іх педагагічнага майстэрства. Недастаткова актыўна ўдасканальваецца методыка выкладання лекцый, правядзення практычных і семінарскіх заняткаў. Зацягваецца распрацоўка некаторых навуковых даследаванняў, а іх тэматыка не заўсёды звязана з патрабаваннямі народнай гаспадаркі. Патрабуе паляпшэння праца з аспірантамі. Аспіранты, асабліва на завочнай форме навучання, нясвоечасова прадстаўляюць кандыдацкія дысертацыі.

Улічваючы ўсё гэта, партыйная арганізацыя нашага факультэта галоўную ўвагу сканцэнтруе на вырашэнні адзначаных пытанняў і так паставіць справу, каб сумеснымі намаганнямі забяспечыць безумоўнае выкананне пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР.

**М. ЕЛІСЕЕЎ,**
**сакратар партбюро гістарычнага факультэта.**

## Адзін дзень факультэта



Сапраўды, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Гэта датычыць і фізічнага факультэта. Праўда, за адзін дзень немагчыма агледзець усе лабараторыі і аўдыторыі. Але спробу зробім...

Якія толькі работы не вядуцца ў навукова-даследчых лабараторыях! Усе яны, трэба зазначыць, маюць важнае народнагаспадарчае значэнне. Пошукі вядуць не толькі навуковыя работнікі, але і самі студэнты.

Вучэбны працэс набірае тэмпы. Будучыя «акадэмікі» толькі пачынаюць прывыкаць пасля летніх канікулаў і сельгасработ да строгага распарадку заняткаў, гучных званкоў і патрабавальнасці выкладчыкаў.

...Ідзе чарговае пасяджэнне камітэта камсамола, хутка пачнуцца заняткі ў лабараторыі механікі, якая належыць

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# НАВІНЫ БДУ

## Адбыўся сход

партыйнага актыву універсітэта. На ім было разгледжана пытанне «Аб задачах партыйнай арганізацыі універсітэта ў святле пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» і пастановы XIX пленума ЦК КПБ».

## Госці з Індыі

пабывалі ў нашым універсітэце напярэдадні новага навучальнага года. Гэта была дэлегацыя таварыства індыйска-савецкай дружбы з Карнатака, штата-пабраціма нашай рэспублікі.

Члены дэлегацыі — дэкан па ўрэгуляванню студэнцкіх праблем Майсорскага універсітэта У. К. Субарайячар і актыўны член ІСКТ Шарада Малебенр з горада Белары — наведалі музей гісторыі універсітэта, вылічальны цэнтр, бібліятэку, агледзелі вучэбныя аўдыторыі. У час гутаркі з прадстаўнікамі адміністрацыі і грамадскіх арганізацый універсітэта госці цікавіліся пытаннямі арганізацыі вучэбнага працэсу, студэнцкага самакіравання, арганізацыяй адпачынку студэнтаў.

## Савет дружбы,

які створаны ў канцы мінулага года, зноў пачынае сваю работу. У яго састаў уваходзяць студэнты і аспіранты, якія прадстаўляюць зямляцтвы і займаюцца ў нашым універсітэце, прадстаўнікі ад рэгіёнаў і старшыні саветаў дружбы ад інтэрнатаў.

Галоўныя задачы, якія стаяць перад саветам: умацаванне сяброўства паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі, развіццё палітычнай актыўнасці, знаёмства замежных студэнтаў з савецкай рэчаіснасцю.

Акрамя гэтага, савет будзе займацца пытаннямі вучобы і навукі замежных студэнтаў, іх культмасавай дзейнасцю, спартыўнай работай, арганізацыяй і правядзеннем нацыянальных свят, тыдняў дружбы і інш.

Па кожнаму з напрамкаў будзе працаваць спецыяльная камісія.

# ТАБЕ, ПЕРШАКУРСНІК

*Знание, и только знание, делает человека свободным и великим.*

Д. ПИСАРЕВ.

*Знание того, какими вещи должны быть, характеризует человека умного; знание того, каковы вещи на самом деле, характеризует человека опытного; знание же того, как их изменить к лучшему, характеризует человека гениального.*

Д. ДИДРО.

*Наше дело — учиться и учиться, стараться накоплять возможно больше знаний, потому что серьезные общественные течения там, где знания, и счастье будущего человечества только в знании.*

А. ЧЕХОВ.



Вось яны — нашы першакурснікі...

З пытаннем у вачах «А што там, наперадзе?» стаялі яны на ўрачыстым пасвячэнні.

Мінуў час хваляванняў і трывог уступных экзаменаў, бяссонных начэй над падручнікам.

Нашы першакурснікі ўжо пасталелі на цэлы месяц і з гонарам вытрымалі экзамен на сельгасработах. Наперадзе — выкананне ленінскага запавету: вучыцца, вучыцца, вучыцца...

*Знание есть сила, сила есть знание.*

Ф. БЭКОН.

*Знание есть сила, и против этой силы не устоят самые окаменелые заблуждения, как не устояла против нее инерция окружающей нас природы.*

А. ГЕРЦЕН.

*Знания, которые выработаны трудом людей, накоплены наукой, все растут, становятся глубже, шире, острей и служат опорой для дальнейшего бесконечного развития наших познавательных способностей и творческих сил.*

М. ГОРЬКИЙ

*То, что мы знаем,— ограничено, а то, чего мы не знаем,— бесконечно.*

П. ЛАПЛАС.

**З ВОПЫТУ КУРАТАРА**

## Сябар і дарадчык

Учарашні абітурыент-школьнік прыйшоў у мнагалюдную сям'ю студэнтаў. Ён шмат чуў аб тым, што студэнцкае жыццё асаблівае, што гэта лепшая пара ў жыцці чалавека. У школе усе дзесяць гадоў вучань ведаў, што трэба рабіць, як вучыцца і праводзіць свой вольны час. Там, пачынаючы з першага класа, маці, настаўніца, піянерважатая дапамагалі яму ў гэтым.

Але вось ВНУ! На лекцыю кожныя дзве гадзіны прыходзіць новы выкладчык і растлумачвае змест «свайго» прадмета, лічачы, што ён самы важны для студэнта. І так кожны дзень па шэсць гадзін. Трэба паспець пачуць, зразумець (адказаць на пытанне сябру па лаўцы) і запісаць самае галоўнае, гэта значыць — трэба ўмець пісаць канспект. А далей — бібліятэка, чытальная зала. Як там атрымаць кнігі, як лепш працаваць з літаратурай, выкарыстоўваючы канспект?

Як лепш спланаваць свой час? Да таго ж, для многіх студэнтаў гэта зусім новае становішча — няма побач твайго вялікага сябра і дарадчыка—маці. Хто ж павінен дапамагчы студэнту як мага хутчэй асвоіцца з новым' жыццём?

Такім чалавекам павінен быць куратар. Другой задачай куратара з'яўляецца стварэнне згуртаванага калектыву. Таму што калі ты жывеш у згуртаваным, сяброўскім калектыве, то і жыццё тваё цікавае і змястоўнае.

Вялікае значэнне для стварэння згуртаванай студэнцкай групы маюць сходы, вечары, культпаходы, правядзенне Ленінскіх залікаў, дыспуты, праца ў СБА.

Толькі патрэбна ўлічыць, што ніводнага мерапрыемства не патрэбна праводзіць фармальна. І лепш дрэнна падрыхтаваны дыспут, вечар, сход не праводзіць, таму што згубіцца цікавасць да наступных мерапрыемстваў.

Умела выкарыстоўвайце той факт, што навучаецеся ў сталіцы рэспублікі. І па заканчэнні БДУ вы панясеце свае веды людзям, а для гэтага патрэбна пастарацца як мага больш узяць за пяць год вучобы.

**Т. ТАРАЙКОЎСКАЯ,**
**куратар,**
**кандыдат хімічных навук.**

Сярод хлопцаў ён выдзяляўся не толькі ростам і моцнымі плячыма, але і вясёлай усмешкай. І я, доўга не думаючы, падышоў да яго.

— Уладзімір Казлоўскі, студэнт пятага курса юрыдычнага факультэта,—коратка прадставіўся ён. Трохі збянтэжыўся, але ўсё ж такі згадзіўся даць інтэрв'ю.

— Уладзімір, ты ўжо, можна сказаць, выйшаў на фінішную прамую вучобы. Пяты курс падводзіць агульны вынік студэнцкага жыцця, адкрывае новы шлях у жыцці для маладых спецыялістаў? Што табе далі студэнцкія пяць год?

— Вучоба ў адной з буйнейшых навучальных устаноў рэспублікі, вядома, дала вельмі многае. Усё нават цяжка пералічыць. Па-першае, расшырыўся кругагляд, расшырыліся веды ў галіне права. Па-другое, тут я пазнаў, што такое студэнцкае сяброўства, моцны студэнцкі калектыў. І самае галоўнае— атрымаю прафесію юрыста.

— Напэўна, мара стаць юрыстам нарадзілася ў цябе яшчэ ў школьныя гады?

— Не зусім так. У школе мне падабалася прафесія настаўніка. Але ў нейкі час я зразумеў, што добры настаўнік з мяне не атрымаецца. Таму вырашыў не спяшацца, набрацца жыццёвага вопыту.

І вось ужо ў арміі стаў усё больш задумвацца аб прафесіі юрыста.

Назаўсёды застануцца ў памяці ўступныя экзамены, першыя дні вучобы, першая сесія...

Бяспрэчна. Успамінаю, як моцна ўразіў мяне універсітэцкі гарадок. Турбавала думка: ці змагу паступіць, ці авалодаю курсам вучобы? Але здаў экзамены паспяхова. І адразу паездка на бульбу. Было вельмі цікава: знаёмства з хлопцамі і дзяўчатамі, праца.

Потым вучоба, першыя лекцыі, першыя семінары. Памятаю, са мной здарыўся даволі цікавы выпадак. Я спазняўся на самую першую лекцыю і калі перабягаў вуліцу на чырвонае святло, быў затрыманы міліцыянерам. Пачуўшы, хто я і куды спяшаюся, ён узяў з мяне слова, што гэта было першае і апошняе маё парушэнне. Юрыст, хоць і будучы, заўсёды павінен быць прыкладам для акружаючых.

Памятаю, як было цяжка здаваць першую сесію. Не было яшчэ ў мяне добрай сістэмы падрыхтоўкі да экзаменаў, не было яшчэ дастатковага вопыту. Усё гэта, бясспрэчна, прыходзіць з гадамі. Але хацелася б параіць першакурснікам, каб яны з першага семестра дакладна планавалі свой час. Нельга спыняцца толькі на вучобе. Расшырэнне свайго кругагляду, наведванне тэатраў, выставак, знаёмства з мастацкай літаратурай, заняткі спортам — усё гэта неад'емная частка студэнцкага жыцця. Вучыцеся берагчы кожную хвіліну!

— Уладзімір, усе чатыры гады ты ўваходзіў у зборную БДУ па футболу. Трэніроўкі і спаборніцтвы аднімаюць шмат часу. Цяжка сумяшчаць вучобу з заняткамі спортам?

— Вядома, цяжка. Асабліва на апошніх курсах вольнага часу застаецца ўсё менш і менш. Больш увагі патрабуе вывучэнне спецыяльнай літаратуры. Але ўсё ж такі вялікая любоў да спорту вымушае мяне больш рацыянальна адносіцца да кожнай вольнай хвіліны.

— Тысячы юнакоў і дзяўчат толькі ўступілі на доўгі, цяжкі, але вельмі цікавы студэнцкі шлях. Што мы ім пажадаем?

— Я ўжо казаў аб сістэме падрыхтоўкі да экзаменаў і аб планаванні свайго працоўнага дня. Хочацца верыць, што першакурснікі ўсё гэта прымуць да ўвагі. Бярыцеся адразу за вучобу. Усе маленькія недахопы к апошняму курсу выліваюцца ў вялікія праблемы. Смела крочце ў студэнцкім страі, актыўна ўдзельнічайце ў камсамольскім жыцці факультэта. Ва універсітэце ў нас шмат добрых традыцый — умацоўвайце і памнажайце іх. Заняткі спортам не адсоўвайце на другі план. Усё гэта вельмі спатрэбіцца вам у жыцці.

Ні пуху вам, ні пер'я, першакурснікі!

**Інтэрв'ю правёў**
**А. ДАБРЫЯН.**

**ПЯЦІКУРСНІК — ПЕРШАКУРСНІКУ**

## Беражыце кожную хвіліну

**Што паказалі карткі ўліку**

## Дастойная змена

З 27 па 31 жніўня камітэт камсамола універсітэта наведалі ўсе першакурснікі.

Паступленне ў сям'ю камсамоліі — гэта свята не толькі для першакурснікаў, але і для ўсёй вялікай універсітэцкай арганізацыі. Знайсці кожнаму камсамольцу справу па душы, зацікавіць яго той ці іншай думкай, прыглядзецца да кожнага камсамольца-першакурсніка — вось зараз галоўная задача камітэтаў камсамола факультэтаў.

Камсамольскія карткі ўліку паказалі, што на змену учарашнім студэнтам, сённяшнім маладым спецыялістам, прыйшла дастойная змена. Дастаткова сказаць, што 169 студэнтаў-першакурснікаў — былыя сакратары школьных камсамольскіх арганізацый, 112 камсамольцаў закончылі музычныя школы, нямала сярод іх спартсменаў-разраднікаў, мастакоў, танцораў.

Усяго на камсамольскі ўлік прынята 1845 камсамольцаў-першакурснікаў. 239 з іх—былыя слухачы падрыхтоўчага аддзялення, якія пабывалі ўжо ў СБА.

Першакурснікі былі ўжо на сваёй першай бульбе. Многія пасябравалі, знайшлі аднадумцаў, акрэсліліся і свае лідэры. Вызначыліся выдатнай працай сярод сваіх сяброў камандзір сельгасатрада геаграфічнага факультэта Валянціна Сцефановіч, у мінулым школьная піянерважатая, Святлана Дзяменцьева, выпускніца 130-й школы горада Мінска.

648 першакурснікаў маюць стаж практычнай работы ад аднаго да пяці год. Пасля звальнення з радоў Савецкай Арміі паступіў на філалагічны факультэт Аляксандр Якубчык. У арміі ён быў камсамольскім сакратаром і першым запявалам. Пасля заканчэння фінансава-эканамічнага тэхнікума паступіла на юрыдычны факультэт Святлана Тарлецкая. Дзяўчына займалася ў прававым гуртку, мае творчыя работы. Закончыла музычную студыю па класу баяна, іграе на гітары, спявае.

І яшчэ аб многіх першакурсніках маглі б мы расказаць, але спадзяемся, што яны самі лепш аб гэтым раскажуць на старонках нашай газеты.

**Г. ФАЛЬКОЎСКАЯ.**

**Прайшло лета. Вярнуліся з будоўляў студэнцкія будатрады. У гэтым годзе СБА імя Героя Савецкага Саюза У. Амельянюка факультэта журналістыкі працаваў у п. Лоухі Карэльскай АССР. Шмат зроблена, убачана, шмат застанецца назаўсёды ў памяці. Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва атрад заняў першае месца сярод СБА зоны. Прадстаўляем вашай увазе старонкі з дзённіка камандзіра Уладзіміра Бельскага.**




### 27 ЛІПЕНЯ

Сёння мы «высадзіліся» на карэльскую зямлю. Нас сем байцоў атрада, кварцір'ераў, або лепш назваць — дэсантнікаў. Сустрэлі прадстаўнікі арганізацыі, адразу звярнулі ўвагу на рост байцоў. Нічога не адказалі... Прамаўчалі. Пакункаў везлі шмат. Акрамя сваіх рукзакоў, мы захапілі з сабой апаратуру для радыёрубкі, музычныя інструменты і шмат іншага, таму адразу пачалі шукаць аўтамашыну. А праз паўгадзіны, не паспеўшы нават пераапрануцца, мы ўжо ўключыліся ў працу. Пакункі склалі на прыступках нашага будучага жылля — некалі рабочага інтэрната. Толькі ў дзве гадзіны ночы пайшлі спаць. Ды якая там ноч! На двары стаяў сапраўдны дзень, але толькі гадзіннік без стомленасці напамінаў аб тым, што дзесьці ў Беларусі стаіць непраглядная ноч.

### І ЧЭРВЕНЯ.

Сябе хваліць неяк нялоўка, але зроблена шмат, нават больш. Інтэрнат падрыхтаваны поўнасцю: у кожным пакоі засцелены ложкі, пастаўлены шафы, тумбачкі, сталы, падрыхтаваны сталоўка, кухня з плітамі электрычнымі і дрывянымі, з санвузлом, халадзільнікам... Пачала ўжо працаваць радыёрубка. Інтэрнат вялікі, і таму у пакоі будзем жыць па траіх. Падрыхтаваны пакой пад рэдакцыю, ленінскі, піянерскі пакоі, сушылка. Вечарам было тэрміновае пасяджэнне штаба: вырашалі пытанне па прыёму атрада. Заўтра ў 20 гадзін прыязджае атрад, а працы яшчэ шмат. Павінны закапаць два флагштокі, вылажыць з бетоннай пліткі лінейку, навазіць пяску і высыпаць двор. Уладзімір Андрыевіч ужо асвоіў кухню, яму і даручана згатаваць абед. Весялун і гарманіст Віктар Чарнушэнка ўзяў на сябе самадзейную частку. За заўтрашні дзень патрэбна яшчэ скончыць мантаж растворнага вузла для нашага будучага аб'екта работы — кацельнай, падрыхтаваць фронт работы для атрада.

### 2 ЧЭРВЕНЯ.

Усё ішло, як было вырашана на пасяджэнні штаба. Майстар атрада Славік Шаўчук з ранку быў на аб'екце. Размеркавалі ўсіх па брыгадах. Самая большая—брыгада муляраў, у якіх і аб'ём работы намячаўся немалы. Работа складаная, улічваючы яшчэ і тое, што атрад выязджае ўпершыню. Хвалявала думка: ці вытрымаем, ці справімся з задачай? У арганізацыі адносяцца да нас як да сапраўдных будаўнікоў. Відаць, ніякай скідкі не будзе.

У 12 гадзін начальнік арганізацыі падаў тэлеграму, у якой гаварылася, што атрад прыбудзе... праз дзве гадзіны. За гэты час раскідалі на нашым двары кучы пяску, прыгатавалі абед, напісалі плакаты, на дзвярах інтэрната павесілі чырвоную стужку.

А вось і ўвесь атрад. Нарэшце! Чарнушэнка, Усеня, Маканік — наш самадзейны ансамбль з музыкай сустракае цягнік, які яшчэ шыпеў тармазамі, а з дзвярэй ужо пачалі высыпаць хлопцы і дзяўчаты. Сустракаць атрад прыйшлі амаль усе работнікі нашай арганізацыі. Тут жа, на вакзале, пасля пастраення ўсіх атрадаў адбыўся наш першы імправізаваны канцэрт. Смех, крыкі, гоман. Далей усё было, як задумана. Лінейка, знаёмства атрада з калектывам арганізацыі. Тут жа на лінейцы байцам мы ўручылі ключы ад пакояў, а начальнік арганізацыі перарэзаў чырвоную стужку...



Байцы. Вось яны, усе святочныя, у зялёнай байцоўскай форме. Байцам гэтым патрэбна ганарыцца. І тым, што ты баец, і тым, што тут, у Карэліі, мы будзем прадстаўляць факультэт, універсітэт, прадстаўляць і кожны сам сябе і атрад імя Героя Савецкага Саюза У. Амельянюка.

### 3 ЧЭРВЕНЯ.

Да абеду дзень быў чыста арганізацыйны: афармленне на работу, праходжанне інструктажу па ТБ, знаёмства з аб'ектам работы, выдача брыгадам інструментаў і рабочай вопраткі. Брыгадзіры агледзелі будучы фронт работы. Працаваць будзем адразу на трох аб'ектах: кладцы сцен кацельнай, пакрыцці даху кацельнай, мантажы стаканаў і апорных калон пад жылыя памяшканні дэпо. На штабе былі выдадзены заданні кожнай брыгадзе. Дакладна падлічыўшы нашы магчымасці, вырашылі аб'екты здаваць датэрмінова. Для нас гэта выгадна яшчэ і тым, што брыгады будуць працаваць паточным метадам. Калі, напрыклад, брыгада мантажнікаў, якую ўзначальваў Алесь Цвях, закончыць работу па мантажу на жылых памяшканнях, тут жа павінны былі туды перайсці брыгады муляраў і кровельшчыкаў, якія ўзначальваюць Павел Стасевіч і Сяргей Давідовіч.

Сёння была першая атрадная лінейка. І адразу ж атрад уключыўся у напружаны рытм. Сёння свята: дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Праграма агітбрыгады падрыхтавана, але кіраўнік Сяргей Сасім ужо нешта змяняў, прыкідваў. А ў 17 гадзін прама на рабочай пляцоўцы мы давалі свой канцэрт. На канцэрт былі запрошаны ветэраны працы. Мікалай Іванавіч Шацёнак у час вызвалення быў у Мінску. Расказваў пра вайну, а на вачах стаялі слёзы ад успамінаў, ад таго, што іх не забылі... У канцы яму ўручылі значок «Мінск — горад-герой». Час ішоў, а са сцэны адпускаць не хацелі — канцэрт удаўся. Прыехалі дамоў з песнямі. Першы дзень працоўнага лета прайшоў на ўзроўні. Што ж, выдатны зарад на будучае.

### 20 ЛІПЕНЯ.

Кажуць, што першы блін заўсёды камяком. Можна пярэчыць. Наш першы «блін» — кацельня — рос, як на дражджах. Прараб В. А. Разін пільна сачыў за нашай работай. Не верыў, зноў і зноў пытаўся, колькі разоў мы былі ў атрадзе. Але сёння я ўжо яму прызнаўся, баяцца не было чаго, аўтарытэт завяваны. Праз тры дні сцены кацельні вышынёй 10 метраў будуць гатовы. Калі пачуў — не паверыў, што з 32 байцоў толькі 12 былі ў будатрадах. Астатнія — упершыню. Паўстала праблема з рыштаваннямі: вышыня вялікая, і працаваць прыходзілася ў складаных умовах. Брыгады не маглі поўнасцю развярнуцца і працаваць змену без перабою. Шмат часу гублялася на ўстаноўку рыштаванняў. Прыкінулі: пры такім тэмпе работы здаць кацельню ў тэрмін не паспеем. Сёння на штабе было вынесена рашэнне: працаваць у дзве змены. Стварылі спецыяльную брыгаду па ўстаноўцы рыштаванняў. Справа павінна пайсці на лад. Востра паўстала пытанне на аб'екце ў Цвяха. Экскаватар найшоў на скалу і ўжо другі дзень безвынікова грукатаў каўшом па камянях. Параіліся з прарабам. Вырашылі паспрабаваць адбойнымі малаткамі. Не зусім радуе і становішча ў кровельшчыкаў: у іх канчаўся ўцяпліцель, а без яго рабіць бетонную сцяжку, заліваць бітумам немагчыма. Патрэбна знайсці нейкі выхад, каб брыгада не прастойвала. Пасяджэнне штаба закончылася позна.



(Працяг будзе)

# ДА ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ ГАЗЕТЫ

Газета «Беларускі універсітэт» — надзейны памочнік партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, прапагандыст і арганізатар цікавых спраў. Не аднаму пакаленню студэнтаў яна была добрым сябрам і дарадчыкам.

Першы нумар газеты выйшаў у 1935 годзе. З таго часу яна стала дзейснай трыбунай студэнтаў і выкладчыкаў.

Шматтыражку робіце вы, паважаныя чытачы! Ад вас залежыць асвятленне шматграннага жыцця універсітэта на старонках нашай газеты.

Пішыце нам пра ўсё, што вас хвалюе і цікавіць.

Газета выходзіць адзін раз у тыдзень — чацвер. Паважаныя таварышы! Выпісвайце і чытайце шматтыражную газету універсітэта.

Падпіска праводзіцца ў студэнцкіх групах, камітэтах камсамола факультэтаў, на кафедрах універсітэта грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.

**Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт».**

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

# Студэнцкая каралева спорту. ЯКАЯ ЯНА?

**Гутарку з нашым карэспандэнтам С. Лыскаўцом вядзе выкладчык кафедры фізічнага выхавання трэнер зборнай каманды універсітэта па лёгкай атлетыцы У. Я. Шпігаў.**

**Уладзімір Якаўлевіч, за вашымі плячамі ўжо дзесяць год працы ва універсітэце. Гэта немалы тэрмін для трэнера. Чаго, на ваш погляд, ужо дасягнула секцыя лёгкай атлетыкі?**

— Сапраўды, дзесяць год працы — гэта нямала. І асабліва працы трэнерскай. Але, бадай, самым прыемным у жыцці кожнага трэнера з'яўляецца адчуванне бясконцага гонару за сваіх выхаванцаў. І зараз мне вельмі прыемна адзначыць тое, што зборная каманда універсітэта штогод з'яўляецца прызёрам у спаборніцтвах сярод мацнейшых ВНУ рэспублікі. З цеплынёй успамінаю я нашых выдатных спартсменаў: Ірыну Чурсіну, Дзмітрыя Гілевіча, Сяргея Версана і іншых.

**— Прабачце, Уладзімір Якаўлевіч, зараз вы назвалі прозвішчы тых, хто трэніруецца непасрэдна ў вашай секцыі. Але, наколькі мне вядома, сярод спартсменаў, якія ўваходзяць у састаў зборнай універсітэта, ёсць і такія, якія рыхтуюцца ў іншых трэнераў...**

— Такіх амаль палова. І справа тут у тым, што трэнерскай работай па лёгкай атлетыцы на кафедры фізічнага выхавання займаюцца лічаныя людзі. Дакладней кажучы, я і Валянціна Васільеўна Зарэцкая. Яна вядзе групу спрынтараў, а я трэніру стаераў. Як бачыце, мы выхоўваем толькі бегуноў на розныя дыстанцыі і не кранаем астатнія віды лёгкай атлетыкі. Таму жадаючыя імі займацца трэніруюцца ў асноўным у іншых секцыях. Але, як ужо паказала практыка, тыя студэнты, якія займаюцца ў нас, выступаюць значна лепш. Таму што мы плануем трэніроўкі так, каб спартсмен дасягаў «піка» сваёй формы ў патрэбны нам тэрмін. Гэта дазваляе максімальна пазбягаць розных нечаканых «сюрпрызаў».

**— Навучальны год пачнецца для вас, Уладзімір Якаўлевіч, як і звычайна, з прыёму ў секцыю навічкоў. Раскажыце, калі ласка, аб тым, хто прыходзіць да вас і які працэнт адсеву пачынаючых?**

— На сённяшні дзень гэта пытанне не можа не хваляваць. Скажу адразу — працэнт адсеву вялікі. І вось чаму. У секцыю штогод запісваецца 8—10 чалавек. Я бяру, безумоўна, сярэднюю лічбу. Людзей, якія б мелі першы разрад, сярод іх амаль няма. Сустракаюцца нават і такія, якія лічаць, што секцыя — гэта шырма, за якой можна схавацца ад агульнай фізічнай падрыхтоўкі. Прапускаецца шмат трэніровак. З такімі студэнтамі нам няма чаго рабіць, нельга праводзіць ніякай сур'ёзнай работы. А ў тых, хто прыйшоў займацца па-сапраўднаму, таксама шмат праблем. Галоўная з іх (і яна кідаецца адразу ў вочы навічку) — адсутнасць неабходнай матэрыяльнай базы. Вось толькі невялікая колькасць фактаў. Раздзявальні не абсталяваны належным чынам, не зачыняюцца. Былі выпадкі крадзяжу рэчаў і адзення. А калі падыходзіць час правядзення агульнауніверсітэцкага кросу ці гарадской эстафеты, дык мы толькі з зайздрасцю глядзім, як іншыя навучальныя ўстановы перавозяць сваіх спартсменаў на аўтобусах ці машынах...

**— Тыя цяжкасці, аб якіх вы толькі што казалі, можна ліквідаваць. І гэта ў вашых сілах. А як быць з «лімітам» часу студэнта?**

— Тэзіс «спартсмен — гэта гультай» стаў зараз, на жаль, вельмі папулярны. Круціцца студэнт як можа. З аднаго боку напірае дэканат, з другога — патрабуе секцыя. І часта здараецца так, што студэнт не вытрымлівае і кідае спорт. А, між іншым, ён сапраўдны працаўнік: і вучыцца, і трэніруецца. Гэта вельмі цяжка. Трэба ўсебакова заахвочваць такіх студэнтаў, ісці ім насустрач.

**— А як справы з летнімі зборамі?**

— Не лепш. Летам у нашай зборнай вельмі адказны экзамен — першынство рэспубліканскага савета «Буравеснік». Рыхтавацца да яго мы павінны ў спартыўна-аздараўленчым лагеры, які размешчаны ў маляўнічым кутку на возеры Нарач. Але туды мы, на жаль, не выязджаем, бо няма там ніякіх умоў для трэніровак. Для валейбалістаў, тэнісістаў, футбалістаў, шахматыстаў умовы ёсць, а для нас, лёгкаатлетаў — няма. Ні бегавых дарожак, ні ям для скачкоў, ні шмат чаго іншага.

**— І апошняе пытанне. Ці запрашаеце вы да сябе ў госці на агульнауніверсітэцкую спартакіяду каманды з іншых ВНУ?**

— Абавязкова. І сёлета мы гэта зробім. Можна спадзявацца, што атрымаецца сапраўднае спартыўнае свята. І, карыстаючыся выпадкам, я запрашаю на яго ўсіх жадаючых.

Беларускі універсітэт

11 кастрычніка 1979 г.
Заказ № 1550. АТ 10871.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ